Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 204 (28314)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Забарона абортаў — панацэя?

СТАР. 4



Агучыць сваю праблему на камеру

СТАР. 5



Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ДВОРНІК, старшыня Гомельскага аблвыканкама:**

*«Стварыць максімальна свабодныя, прадказальныя, спрыяльныя ўмовы і магчымасці для інвестараў — галоўны прыярытэт і змест рэгіянальнай інвестыцыйнай палітыкі. Органы мясцовай улады Гомельшчыны вядуць пастаянную актыўную работу па пошуку новых партнёраў і адкрыцці новых рынкаў. Паслядоўна знімаюцца бар'еры на шляху развіцця гандлю і тэхналогій, руху інвестыцый і працоўнай сілы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9064 | ▼ |
| Еўра | 2,0914 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0305 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0741 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ЖЫВАЯ ПРЫРОДА Ў РУКАХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар пасёлка Мір Карэліцкага раёна **Пётр НАРБУТОВІЧ** знаёміцца з дзейнасцю аграсядзібы «У Нікадзіма», якая сваю работу будуе на культурным, гістарычным і сельскім напрамках адпачынку.

■ Нашы

# ІВАН З БЕЛАРУСІ

**Пісьменнік Іван Муравейка напярэдадні свайго 95-годдзя расказаў журналістам «Звязды» пра самае запаветнае**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Пра тое, што ў гэтай сціплай хаце, якая знаходзіцца ў цэнтры Любані, жыве ветэран Вялікай Айчыннай вайны, выпадковаму падарожніку падказвае адпаведная шыльдачка. Але не напісана там (ды і навошта, калі і так пра гэта ведае амаль кожны любанец і не толькі), што гэты дом ужо больш як паўстагоддзя з'яўляецца і месцам прытулку, і працоўным кабінетам беларускага пісьменніка Івана Муравейкі.**

Калі мы завіталі ў госці да майстра, нават не здзівіліся, што засталі яго за драўляным сталом у вялікім пакоі — менавіта тут былі напісаны многія творы аўтара. Іван Андрэевіч якраз шліфаваў новы верш, напісаны на днях:

*Іду на «100», але мая душа,*
*Паверце, не старэе, не марнее.*
*Бясконца б слухаў, як гудзе шаша,*
*Як узлятаюць у блакіт арэлі...»*

Я дачытваю верш да канца і лаўлю кожнае слова пісьменніка, якому, між іншым, 21 кастрычніка спаўняецца 95 гадоў!

СТАР. 13

■ Сказаць і пачуць

# Будучае — за паразуменнем

**Не той лепшы, хто ў судзе ўсіх «парве», а той, хто зможа дамовіцца аб супрацоўніцтве да суда**

**Добрыя перагаворшчыкі — людзі, якія могуць прымаць удзел у складаных размовах. А добрыя медыятары — тыя, хто можа дапамагчы наладзіць гэтыя складаныя перамовы. Такая думка прагучала на першым у свеце рускамоўным міжнародным студэнцкім конкурсе па медыяцыі і перамовах, што адбыўся ў Мінску. Дагэтуль падобныя мерапрыемствы арганізоўваліся толькі ў Еўропе і толькі на англійскай мове.**

Унікальнае відовішча прайшло ў форме дзелавой гульні, падчас якой спаборнічала 16 камандаў студэнтаў з васьмі ўніверсітэтаў Беларусі і Расіі пад наглядам 16 суддзяў — медыятараў з Вялікабрытаніі, Расіі і Беларусі, а таксама з удзелам прафесійных канфліктолагаў, псіхолагаў, эканамістаў і юрыстаў.

## Адна гісторыя — розныя шляхі гульні

Праз камерцыйную медыяцыю (урэгуляванне канфлікту ў бізнесе) удзельнікі конкурсу павінны былі вырашыць спрэчку паміж замежным інвестарам, што планаваў будаўніцтва хімзавода, і ўладамі горада, якія на чале з эколагамі выступаюць супраць гэтай ідэі.

Коратка гісторыя гучала так. «У невялікім прыморскім гарадку N. замежны інвестар Герман Кроль наладзіў вытворчасць каляровых угнаенняў шляхам перапрацоўкі рыбы. Частка непрыдатнай для работы прадукцыі выкідвалася на сметнік, адкуль непрыемны пах даносіўся да жыхароў. Інвестар вырашыў мадэрнізаваць вытворчасць праз будаўніцтва новага завода па вырабе ўгнаенняў. Ён прадставіў план і просьбу выдзеліць участак пад будаўніцтва. Узгадненне дакументаў ішло цяжка, з улікам шматлікіх пажаданняў розных органаў. Тым не менш праз год Кроль атрымаў у арэнду на дзевяць гадоў участак зямлі і дазвол на будаўніцтва, яшчэ праз пяць месяцаў — падрыхтаваў праект і набраў штат супрацоўнікаў.

СТАР. 2

## НА ТЭЛЕБАЧАННЕ ПАВІННЫ ПРЫЙСЦІ ДОБРЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ ПЕРАДАЧЫ

**Учора ў Мінаблвыканкаме адбыўся семінар-нарада па сацыяльных пытаннях. У ім прыняла ўдзел намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

«На выхадных часам бяру пульт, праглядаю каналы: няма нармальных дзіцячых перадач, якія, напрыклад, мы ў дзяцінстве глядзелі. А яны ж дзецям цікавыя і такія перадачы павінны быць, у тым ліку на рэгіянальным тэлебачанні», — адзначыла віцэ-прэм'ер.

Важна, каб дзеці ў тым ліку праз такія перадачы атрымлівалі станоўчую інфармацыю. Гэта работа сёння асабліва важная ў сувязі з апошнімі падзеямі (нападзенне ў ГЦ «Еўропа», падлеткавыя суіцыды. — **Заўвага БЕЛТА**), адзначыла Наталля Качанава. «Нам патрэбны добрыя дзіцячыя перадачы, станоўчая інфармацыя, якую атрымлівалі б нашы дзеці», — падкрэсліла яна. Таксама Наталля Качанава даручыла павысіць эфектыўнасць работы псіхолагаў у школах. «Калі ёсць псіхолаг у школе, няхай ён сто разоў пагаворыць з настаўнікам, паглядзіць на тое ці іншае дзіця, на яго паводзіны, — сказала яна. — Не заўсёды адэкватныя паводзіны дзяцей мы павінны бачыць і своечасова спыняць. Гэта нельга прапускаць. У нас выбудавана структура, якая павінна працаваць на ўсіх узроўнях, — дзіцячы сад, школа і гэтак далей».

Віцэ-прэм'ер адзначыла неабходнасць больш уважлівага падбору кадраў у гэтай галіне. «Псіхолаг працуе з чалавечым лёсам, чалавечай душой. І трэба ўважліва да гэтага падыходзіць. Падбярыце нармальныя кадры. Сёння нашы ВНУ рыхтуюць вялікую колькасць спецыялістаў. Іх больш чым дастаткова», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Таксама на нарадзе закранулася і такое пытанне, як аптымізацыя школ і дашкольных устаноў. Гэтую праблематыку, лічыць Наталля Качанава, неабходна тлумачыць насельніцтву на месцах. «Калі вы прымаеце рашэнне зачыніць нейкую школу або дзіцячую дашкольную ўстанову, то перш, чым гэта зрабіць, добра адпрацуйце пытанне з насельніцтвам, — адзначыла Наталля Качанава. — Вы павінны выехаць на месца 10 разоў, растлумачыць, паказаць усё людзям, і яны зразумеюць. Бо дзесьці такія ўстановы зачыняюцца, а недзе будуюцца і адчыняюцца новыя».

■ Іншыя рэаліі

# БЛАКАДА КУБЫ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

## Пасол гэтай краіны прапануе беларусам прагаласаваць супраць

**Маленькая краіна ў Карыбскім моры ўжо больш за паўстагоддзе пакутуе ад блакады з боку Злучаных Штатаў Амерыкі. Прычым працяўнік настолькі моцны, што накладае штрафныя санкцыі і на прадпрыемствы іншых дзяржаў, якія жадаюць супрацоўнічаць з Востравам Свабоды. Як заявіў на прэс-канферэнцыі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Куба ў нашай краіне спадар Херарда СУАРЭС АЛЬВАРЭС, блакада яго дзяржавы — самая працяглая і самая жорсткая ва ўсёй гісторыі санкцый.**

Каб пазбавіцца ад гэтага дзікунства ў сучаснай гісторыі, дыпламат прапанаваў нам, беларусам, далучыцца да глабальнай акцыі «Я галасую супраць блакады Кубы». На сайце www.cubavsbloqueo.cu праходзіць галасаванне ў рэжыме анлайн супраць палітыкі, уведзенай Злучанымі Штатамі. Кожны можа зайсці на сайт і пакінуць там свой голас і, пры жаданні, каментар.

— На жаль, у чарговы раз мы вымушаны заяўляць аб балючай для нас тэме, — адзначыў падчас сустрэчы з журналістамі спадар Херарда Суарэс Альварэс. — Куба ўжо 24 гады прадстаўляе ў Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый рэзалюцыю «Набходнасць спынення эканамічнай, гандлёвай і фінансавай блакады, уведзенай Злучанымі Штатамі Амерыкі супраць Кубы». 26 кастрычніка — ужо на наступным тыдні — у Генасамблеі будзе абмяркоўвацца 25 рэзалюцыя.

Ужо на працягу 25 гадоў пераважная большасць членаў ААН галасуе ў падтрымку дадзенай рэзалюцыі. Калі ў 1992 годзе Кубу падтрымалі 52 дзяржавы, то ў мінулым — 193, супраць былі толькі дзве — Злучаныя Штаты і Ізраіль.

Эканамічная, гандлёвая і фінансавая блакада Кубы працягваецца, нягледзячы на аднаўленне дыпламатычных адносін — у тым ліку працы пасольстваў — паміж Кубай і ЗША ў мінулым годзе, а таксама візіт на Кубу Барака Абамы, прэзідэнта Злучаных Штатаў у сакавіку бягучага года. Спадар Херарда Суарэс Альварэс называе гэта толькі пачаткам той працы, якую неабходна правесці, каб блакада нарэшце была знята.

Па словах кубінскага дыпламата, нягледзячы на тое, што зараз многія кажуць аб вырашэнні крызісу ў кубіна-амерыканскіх адносінах, блакада, на жаль, засталася. У сакавіку было дазволена выкарыстоўваць долар ЗША ў міжнародных фінансавых аперацыях Кубы. Тым не менш, паведамляе дыпламат, дагэтуль паміж дзяржавамі не ўстаноўлены нармальныя банкаўскія адносіны.

Як і раней, ЗША забараняюць экспарт на Кубу тавараў і абсталявання. Па-ранейшаму адна з самых яркіх краін Лацінскай Амерыкі пазбаўлена магчымасці свабодна экспартаваць тавары і паслугі ў Злучаныя Штаты, не можа ўстанаўліваць прамыя банкаўскія адносіны з гэтай краінай, а таксама прымаць амерыканскія інвестыцыі ў іншыя сферы эканомікі, за выключэннем тэлекамунікацый. Акрамя гэтага, застаецца дзеючай забарона для амерыканскіх грамадзян наведваць Кубу ў турыстычных мэтах. Куба, дарэчы, з'яўляецца адзінай дзяржавай, куды не можа прыехаць амерыканскі турыст.

Дыпламат таксама падкрэсліў, што, як і раней, блакіруюцца грашовыя пераводы на Кубу — нават калі яны здзяйсняюцца не ў амерыканскіх доларах.

— Працягвае мець месца накладанне штрафаў на банкі і фінансавыя ўстановы, што маюць сувязі з нашай краінай, — заявіў Херарда Суарэс Альварэс. — Толькі з красавіка мінулага года па красавік бягучага была распачата 61 карная мера супраць замежных банкаў, якія маюць хоць нейкія адносіны з Кубай. Прыкладам таму служыць рашэнне нямецкага банка Commerzbank аб спыненні аперацый з Кубай. Гэта — вынік штрафу ў 1,7 млрд долараў, які ўстанавілі ЗША ў сакавіку 2015 года.

Агульная ж эканамічная страта Кубы за больш чым паўстагоддзе блакады склала (у пераліку на цяперашнія цэны) звыш 125 мільярдаў амерыканскіх долараў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# Будучае — за паразуменнем

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Завод планавалася збудаваць за восем месяцаў. Аднак члены мясцовага таварыства зялёных «Экашчасце» правялі несанкцыянаваны мітынг супраць будаўніцтва, сцвярджаючы, што вынікі міжнароднай экалагічнай экспертызы купленыя і прадпрыемства пагоршыць сітуацыю ў горадзе. Яны патрабавалі спынення работы і таго дамагліся. Хоць афіцыйна ніякімі паперамі гэта не пацвярджалася, аднак супрацоўнічаць з кампаніяй Кроля ўсе адмовіліся. Бізнесмен застаўся без будаўнічых матэрыялаў і тэхнікі. Праз паўгода безвыніковай барацьбы ён звярнуўся ў суд з просьбай выплаціць кампенсацыю $2 млн за час, які згубіў праз дзеянні «зялёных» і маўчанне ўладаў».

Кейс з умовамі гэтага канфлікту атрымалі ўсе студэнты, якіх падзялілі на каманды-перагаворшчыкі і каманды-медыятары. Гісторыя прайгравалася раз за разам. Два студэнты выступалі ў ролях інвестара і яго адваката, два былі мэрам горада (які адначасова прадстаўляў і жыхароў, і эколагаў, і ўладу) і яго адвакатам. Яшчэ двум дасталася роля мадэратараў.

— Студэнты, якія да таго ж атрымлівалі і іншыя ролі перад кожнымі перамовамі, мусілі высветліць свой інтарэс, выпрацаваць стратэгію размовы і даказаць сваю пазіцыю. Галоўным пры гэтым было — дабіцца прадукцыйных перамоў. У рэальным жыцці падпісаць пагадненне ў такім канфлікце за паўтары гадзіны (столькі адводзілася на кожную сесію) не атрымалася б, — расказала **галоўны арганізатар конкурсу Кацярына ГАМЗУНОВА**, адвакат, медыятар, трэнер Цэнтра медыяцыі і перагавораў.

— Усе настолькі захапляліся сваімі ролямі і ўваходзілі ў вобраз, што на адной з сустрэч Кроль размаўляў з акцэнтам і вельмі натуральна паўтараў, што не столькі грошы яму важныя, а ўкладзеныя ў прадпрыемства сілы, слёзы і пот, — апісала працэс **Карына КАСЦЕВІЧ, памочнік Кацярыны Гамзуновай**.

### Ціхая рэвалюцыя ў тэхналогіі перамоў

У гэтым і была сутнасць гульні і конкурсу — каб студэнты змаглі максімальна паказаць свае здольнасці. Нягледзячы на тое, што яны яшчэ вучацца, важнасць арганізацыі такога мерапрыемства ў свеце і тым больш у Беларусі для развіцця медыяцыі нельга недаацэньваць.

— Мы ішлі да стварэння рускамоўнага конкурсу два гады. Прымалі ўдзел у такіх мерапрыемствах у Вене, Парыжы. Для нас святам была ўжо магчымасць прайсці адбор на ўдзел у іх. Конкурс у Беларусі — вялікі крок для нашай краіны, і рэалізаваная мара для мяне асабіста, — падзялілася Кацярына Гамзунова. — Ён скіраваны перш за ўсё на інфармаванне моладзі аб існаванні працэдуры медыяцыі. Каб тыя, хто расце нам на змену, атрымалі гэтыя веды раней, чым мы, цяперашнія медыятары, і, адпаведна, шырэй распаўсюдзілі іх сярод насельніцтва.

— Ва ўсім свеце мноству людзей патрэбна дапамога ў вырашэнні складаных канфліктаў. Медыятары павінны ўмець весці перамовы ў спрэчках у самых розных галінах. Важнасць гэтага конкурсу падкрэсліваецца для мяне вопытам, які я зараз атрымліваю на прыкладзе сваёй краіны, Вялікабрытаніі, у сувязі з яе выхадам з ЕС. Было б добра, каб вяліся перамовы да таго, як ажыццяўляць пэўныя рашэнні. Ваша пакаленне павінна лепш, чым наша, умець дамаўляцца і дапамагаць рабіць гэта іншым, — зазначыў **Біл МАРШ, міжнародны медыятар, кансультант і трэнер па медыяцыі і вырашэнні канфліктаў.**

Медыяцыя — шматгранная і вельмі перспектыўная з'ява. Сёння яна ўжывацца, як правіла, у галіне прыватна-прававых адносін. Аднак расце колькасць камерцыйных медыяцый, у тым ліку і паміж вялікімі міжнароднымі карпарацыямі. Гучаць таксама думкі, што трэба карыстацца медыяцыяй у адукацыі, экалогіі і іншых сферах жыцця.



**Фінал першага рускамоўнага міжнароднага студэнцкага конкурсу па медыяцыі і перамовах. У ролі медыятараў студэнт Расійскага дзяржаўнага ўніверсітэта правасуддзя і Яўгенія РАМБЛ, практыкуючы сямейны медыятар з Вялікабрытаніі. У ролі Германа Кроля і адваката — студэнты Усерасійскай акадэміі знешняга гандлю Мінэканомразвіцця Расійскай Федэрацыі. У ролі мэра г. N і адваката — студэнты Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

— Будучае не за тым, каб знайсці кагосьці вінаватага, і не той лепшы спецыяліст, хто «парве» ўсіх у судзе. Будучае за супрацоўніцтвам. А медыяцыя — той механізм, што дазваляе пасадзіць людзей за стол перамоў, знайсці агульныя інтарэсы і ўзгадніць іх, — выказалася **Лілія УЛАСАВА, медыятар, заснавальнік Цэнтра медыяцыі і перагавораў**. — Ужо цяпер міжнародныя буйныя кампаніі за год заключаюць 200—300 медыяцыйных пагадненняў са сваімі дачарнымі кампаніямі. Дзякуючы медыяцыі здарылася ціхая рэвалюцыя ў тэхналогіі перамоў.

Па выніках конкурсу былі вызначаны два пераможцы сярод каманд-медыятараў. Першае месца дасталася Расійскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту правасуддзя. Другое — Гродзенскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Я. Купалы.

Камандам-перагаворшчыкам прысуджаны тры прызавыя месцы. Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь перамагла ў фінальнай схватцы Усерасійскую акадэмію знешняга гандлю Мінэканамразвіцця Расійскай Федэрацыі. А трэцяе месца занялі студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

## Прадстаўнікі Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН прыедуць у Мінск

**Яны абмяркуюць перспектывы супрацоўніцтва на міжнароднай канферэнцыі «Закладваючы асновы ў рэгіёне ЕЭК ААН для эканамічнай інтэграцыі і ўстойлівага развіцця да 2030 года». Аб гэтым паведаміў на брыфінгу начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

Канферэнцыя адбудзецца 26 — 27 кастрычніка. Удзельнікі абмяркуюць чатыры блокі пытанняў: гандаль і стандарты, транспарт і інфраструктура, энергетыка і зялёная эканоміка, інвестыцыі і інавацыі. Мерапрыемства мае навукова-практычны характар і накіравана на тое, каб знайсці новыя шляхі эканамічнага супрацоўніцтва і ўмацаваць ўзаемадзеянне паміж інтэграцыйнымі аб'яднаннямі, якія прысутнічаюць у рэгіёне ЕЭК ААН.

> **Даведка «Звязды»**
> **Еўрапейская эканамічная камісія — адна з пяці рэгіянальных камісій ААН. Яе дзейнасць накіравана на развіццё эканомік дзяржаў, умацаванне эканамічных сувязяў унутрыеўрапейскага рэгіёна, а таксама паміж гэтым рэгіёнам і астатнім светам.**

На міжнароднай канферэнцыі на высокім узроўні будзе прадстаўлена Еўразійская эканамічная камісія і СНД. У Мінску збяруцца прадстаўнікі АБСЕ, Генеральнага дырэктарата па гандлі Еўрапейскай камісіі, Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы, Сусветнай харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі, ПРААН. Плануецца шэраг двухбаковых сустрэч.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Чулі?

## МАРКІРОЎКА «ВА ЎЗРОСЦЕ»

**З 1 ліпеня наступнага года забараняецца продаж інфармацыйнай прадукцыі без узроставай маркіроўкі.**

Гэта прадугледжана пастановай урада ад 17 кастрычніка, паведамілі ў прэс-службе Саўміна.

Прадугледжваецца, што інфармацыйная прадукцыя ў выглядзе прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі, друкаваных выданняў, аўдыёвізуальных твораў, фанаграм, гульняў (у тым ліку гульняў з электронным дысплеем, камп'ютарных гульняў) і праграм на любых відах носьбітаў альбо ў выглядзе інфармацыі, якая распаўсюджваецца з дапамогай культурных мерапрыемстваў, павінна мець прысвоены ва ўстаноўленым парадку знак узроставай катэгорыі, за выключэннем выпадкаў, калі наяўнасць такога знака з'яўляецца неабавязковым у адпаведнасці з заканадаўствам Беларусі.

Забараняецца продаж інфармацыйнай прадукцыі без знака ўзроставай катэгорыі, за выключэннем выпадкаў, калі наяўнасць такога знака з'яўляецца неабавязковай у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі

■ Даследаванне

# НАЙМАЛЬНІКІ ВЫБІРАЮЦЬ МУЖЧЫН?

## Эксперты вывучаць сітуацыю з гендарнай дыскрымінацыяй на рынку працы

**Ці часта ў дзяўчат на субяседаванні пытаюцца, ці замужам яны, а жанчынам з дзецьмі адмаўляюць у прыёме на работу, бо не хочуць трациться на бальнічныя? Каб даследаваць сітуацыю з гендарнай дыскрымінацыяй на рынку працы, міжнародная грамадская арганізацыя «Гендарныя перспектывы» запусціла кампанію #ПолНеПотолок. Жанчынам і мужчынам, якія сутыкнуліся з прадузятым стаўленнем наймальнікаў, прапануюць дзяліцца сваімі гісторыямі.**

— У нас ёсць ускосныя пацвярджэнні таго, што гендарная дыскрымінацыя дагэтуль існуе. Беларуская статыстыка паказвае і разрыў у аплаце працы мужчын і жанчын, і тое, што апошнія менш заняты як прадпрымальнікі. Але мы хочам атрымаць сведчанні з першых вуснаў, — расказвае **старшыня праўлення арганізацыі Ірына АЛЬХОЎКА**. — Гісторыі размяркуем па катэгорыях, і наш юрыст будзе даваць кансультацыі агульнага характару, як паступаць у тыповых выпадках.

Нізкі заробак і невысокія пасады жанчын часта тлумачаць тым, што яны самі не імкнуцца ў кіраўнікі. Эксперт згаджаецца: вядома, не ўсім дамам важна кар'ера. Як і не ўсім мужчынам.

— Пытанне ў тым, што, калі жанчына гэтага захоча — якія ў яе шанцы? Вельмі часта на «дзявочых» факультэтах студэнтам-хлопцам аддаюць перавагу толькі таму, што іх менш. Па-чалавечы гэта называецца несправядлівасцю. Такі падыход неэфектыўны нават з пункту гледжання эканомікі. Жанчыны даўжэй вучацца, больш падрыхтаваны — атрымліваецца, на іх адукацыю дарма трацяцца грошы? — разважае старшыня праўлення «Гендарных перспектыў».

Па назіраннях эксперта, праблемы на рынку працы часта ўзнікаюць у маці з непаўналетнімі дзецьмі:

— Зразумела, кожны наймальнік зацікаўлены ў тым, каб работнік быў на сваім месцы кожны дзень, цалкам аддаваўся справе і нікуды не адлучаўся. Але з іншага боку, калі мы кажам, што паважаем мацярынства як велізарную працу і гэта мае значэнне не толькі для канкрэтнай сям'і, але і для краіны, тады работадаўцы таксама павінны дзяліць гэту адказнасць з грамадствам і дзяржавай. А атрымліваецца, што ўся нагрузка па выхаванні дзяцей і адпаведна складанасці з пошукам работы кладуцца на плечы жанчын.

Што да мужчын, то ім наймальнікі часам не хочуць прадастаўляць водпуск па доглядзе за дзіцем. І нават не ведаюць, што з малым можа сядзець не толькі маці. Ірына Альхоўка згадвае выпадкі, калі да іх у арганізацыю звярталіся мужчыны і прасілі: «Патэлефануйце ў маю бухгалтэрыю, раскажыце, што я маю такое права».

Яшчэ адна праблема — сексуальнае дамаганне на працоўным месцы.

— Гэта ўвогуле забароненая тэма. Вельмі шмат тут патрыярхальных стэрэатыпаў. Я нядаўна пачула меркаванне, што флірт на рабоце спрые лепшай вытворчасці працы. Але гэта мужчынскі пункт гледжання: не ўсе жанчыны гатовы слухаць жарты накот бландзінак і знешняга выгляду. Той наймальнік, які хоча мець здаровыя адносіны ў калектыве, павінен быць зацікаўлены ў палітыцы, дзе кожны супрацоўнік будзе адчуваць сябе ў бяспецы, — лічыць эксперт.

Падчас кампаніі плануецца таксама правесці дыскусію з чыноўнікамі, спецыялістамі працоўных інспекцый, наймальнікамі і юрыстамі, каб абмеркаваць, як праблемы гендарнай дыскрымінацыі можна вырашаць. У краінах Еўрасаюза, напрыклад, даказваць факт дыскрымінацыі павінен не работнік, а наймальнік. У нас наадварот. І гэта практычна немагчыма, бо падобныя выпадкі звычайна адбываюцца адзін на адзін. Да таго ж у нашым заканадаўстве ёсць толькі забарона на дыскрымінацыю, але няма азначэння паняцця. Гэта значна ўскладняе праваправмяняльную практыку.

Ірына Альхоўка заўважае, што яны ні ў якім разе не хочуць рабіць наймальнікаў ворагамі і вінавацiць іх ва ўсім:

— Сваёй задачай мы бачым расказаць, у чым перавага змешанага калектыву, работнікаў, у якіх ёсць дзеці. Як правіла, гэта вельмі лаяльныя супрацоўнікі. Калі ў цябе ёсць дзіця, ты не зацікаўлены ў тым, каб часта мяняць работу, бо табе патрэбна стабільнасць. У Швецыі, напрыклад, лічаць, што лепшы трэнінг па менеджменце — гэта бацькоўства. Бо бацькоўства вучыць усяму — і весці перамовы, і планаваць свой час, і выконваць шмат задач. На трэнінгу гэта штучная сітуацыя, а ў сям'і — натуральная.

*Падзяліцца сваёй гісторыяй аб дыскрымінацыі на рабоце па прыкмеце полу можна на старонцы ў сацыяльнай сетцы Фэйсбук пад хэштэгам #ПолНеПотолок. Ці даслаць яе на электронную скрыню pol_ne_potolok@genderperspectives.by, калі хочаце захаваць ананімнасць.*

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

**Каментарый у тэму**

Абмежаванне ў працоўных правах ці атрыманне нейкіх пераваг у залежнасці ад полу беларускім заканадаўствам забаронена. А работнікі, якія маюць сямейныя абавязкі, могуць разлічваць на дадатковыя гарантыі.

— Пры гэтым права на гарантыі, якія даюцца заканадаўствам і калектыўнымі дагаворамі маці, прадастаўляецца таксама бацькам, што выхоўваюць дзяцей адны, — заўважае **начальнік аддзела працоўнага заканадаўства юрыдычнага ўпраўлення ведамства Ірына ПЫРКО.**

Іншая справа, што на практыцы роўнасць не заўсёды захоўваецца. І Беларусь тут не выключэнне — гэта сусветная тэндэнцыя. Нашы жанчыны зарабляюць у сярэднім на 23 працэнты менш за мужчын. Доля прадстаўніц прыгожага полу ў парламенце — 30 працэнтаў, сярод кіраўнікоў — 48 працэнтаў (але трэба ўлічваць, што гэта, як правіла, кіраўнікі ніжэйшага ўзроўню). А ў водпуск па доглядзе за дзіцем ідзе толькі адзін працэнт мужчын (сярод іх і таты, і дзядулі).

■ Абітурыент-2017

# РЭПЕТЫЦЫЙНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ: РАЗВЕДКА БОЕМ...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Колькі тэстаў дазволяць здаваць абітурыентам у наступным годзе — тры ці чатыры? Безумоўна, гэта пытанне хвалюе многіх. Але пакуль змяненні ў парадку прыёму ў ВНУ не зацверджаны, будучым выпускнікам застаецца арыентавацца на правілы, якія дзейнічалі ў папярэднія гады. Праўда, у дачыненні да рэпетыцыйнага тэсціравання ніякія абмежаванні на колькасць дысцыплін, па якіх можна здаць тэсты, не ўплываюць. Як не дзейнічаюць і абмежаванні па ўзросце. Паўдзельнічаць у «рэпетыцы» могуць не толькі вучні выпускных класаў, але і дзесцікласнікі.**

Першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання ў беларускіх ВНУ стартаваў у кастрычніку. Пералік устаноў, дзе яно будзе праводзіцца па матэрыялах арганізатараў ЦТ, і графік правядзення можна знайсці на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў. У многіх навучальныя ўстановы запісацца на рэпетыцыйнае тэсціраванне цяпер можна не выходзячы з дома — на іх сайтах адкрыта анлайн-рэгістрацыя.

Апрацоўка бланкаў адказаў удзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання і разлік бальнікаў будуць ажыццяўляцца па тэхналогіі ЦТ. Інфармацыю пра свае вынікі абітурыенты змогуць атрымаць на сайце РІКВ па асабістым кодзе ўдзельніка. Пасля завяршэння першага этапу рэпетыцыйнага тэсціравання на сайце Інстытута кантролю ведаў абітурыенты таксама па асабістым кодзе ўдзельніка змогуць атрымаць адказы да заданняў тэста для правядзення работы над памылкамі.

Удзельнікам рэпетыцыйнага тэсціравання трэба мець на ўвазе, што працэдура яго правядзення нічым не адрозніваецца ад цэнтралізаванага. Задача арганізатараў у аўдыторыях — прытрымлівацца ўсіх правілаў правядзення ЦТ, каб адразу настроіць абітурыентаў на сур'ёзны лад і змадэляваць рэальную псіхалагічную абстаноўку правядзення экзамену: прысутнасць мабільнікаў, дапаможнікаў і шпаргалак у экзаменацыйнай аўдыторыі катэгарычна не дапускаецца. Арганізатарам дазваляецца кансультаваць удзельнікаў рэпетыцыі толькі па тэхналогіі работы над тэстам і па парадку запаўнення бланка, але ніякіх кансультацый па змесце тэстаў.

Да пачатку ўступнай кампаніі абітурыенты змогуць праверыць свае веды некалькі разоў. Першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання будзе доўжыцца да канца гэтага года. Другі этап пройдзе ў студзені-лютым. Трэці — у сакавіку-красавіку.

Пачынаючы з кастрычніка, непасрэдна ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў для ўсіх ахвотных арганізуецца і камп'ютарнае тэсціраванне. Падчас яго прапануюцца заданні з той жа базы, што і на звычайным. Розніца ў тым, што абітурыент працуе перад камп'ютарным маніторам і напрыканцы выпрабавання можа адразу ўбачыць свой вынік. У абітурыента ёсць магчымасць тут жа папрацаваць над памылкамі. Спачатку да няправільна выкананых заданняў яму даецца падказка, а калі і яна не дапамагае, можна проста «падгледзець» правільнае рашэнне.

У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў адкрыта анлайн-рэгістрацыя на камп'ютарнае тэсціраванне. Яно праводзіцца кожны дзень: з панядзелка па пятніцу — з 14:00 да 18:00, а ў суботу «рэпетыцыйная сесія» стартуе ў 11 гадзін.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Год культуры

# ПАД ГУКІ СІМФАНІЧНАГА АРКЕСТРА...

**Сёння грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» збірае сваіх актывістаў у Беларускай дзяржаўнай філармоніі на музычную вечарыну. Мерапрыемства праходзіць у рамках Года культуры.**

Як паведамляе прэс-служба «Белай Русі», госці вечарыны «змогуць у нефармальнай абстаноўцы абмеркаваць актуальныя пытанні грамадскага жыцця краіны і паслухаць класічную музыку ў выкананні Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Аляксандра Анісімава».

— Такія тэматычныя канцэрты для нас ужо сталі традыцыяй, — адзначыў **намеснік старшыні «Белай Русі» Аляксандр ШАЦЬКО**. — У сталіцу прыедуць актывы нашых абласцей. Мы збіраемся паслухаць музыку, пагутарыць...

Ён таксама паведаміў, што ў рамках Года культуры «Белая Русь» зрабіла многае:

— Мы плённа супрацоўнічалі з аўтарамі, якія пішуць для дзяцей, прымалі ўдзел у мерапрыемствах, прымеркаваных да Дня пісьменства, правялі конкурс «Залатое пяро Белай Русі», у якім прынялі ўдзел каля 1,5 тысячы маладых аўтараў з усёй краіны.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Пранізлівы вецер разам з дажджом

## А на наступным тыдні сіноптыкі абяцаюць нам яшчэ і мокры снег



**Даволі моцны парывісты вецер і дажджы чакаюцца на гэтыя выхадныя, паведамляе галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Праўда, у пятніцу тэрыторыя Беларусі застанецца яшчэ пад уплывам зоны павышанага атмасфернага ціску і толькі ў заходнія раёны завітае франтальны раздзел. Удзень будзе воблачна з праясненнямі. На большай частцы краіны ападкаў не будзе, толькі ў асобных раёнах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей пройдуць дажджы. Вецер прагназуецца паўднёва-ўсходні ўмераны, у асобных раёнах магчымы парывы да 14 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад 4—9 цяпла. У выхадныя атмасферныя франты пачнуць гаспадарыць у нас ужо паўсюдна, толькі па паўночным усходзе яшчэ захаваецца ўплыў антыцыклону.

Таму ў суботу ўначы ў заходніх, а ўдзень і ў цэнтральных раёнах краіны чакаюцца дажджы. Адчуванне кепскага і халоднага надвор'я будзе максімальным, бо дыскамфорту дадасць моцны вецер, парывы якога па паўночным захадзе могуць дасягаць 15—18 м/с. Самыя складаныя ўмовы надвор'я ў гэтыя дні чакаюцца ўначы, калі тэмпература паветра складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, а па паўночным усходзе пры невялікай воблачнасці паветра тэрмометр апусціцца да мінус 1—5 градусаў. Удзень будзе ад плюс 2 да плюс 8 градусаў.

У нядзелю таксама чакаецца некамфортнае надвор'е, калі на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца дажджы. Уначы і раніцай па паўночным захадзе магчыма ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 6 градусаў, удзень — 2—8 цяпла, а па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да плюс 10 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, на пачатку наступнага тыдня чакаецца няўстойлівае надвор'е з ападкамі. У панядзелак і аўторак краіна будзе знаходзіцца пад уплывам франтальных раздзелаў, якія перамяшчаюцца з паўднёвага захаду Еўропы. На большай частцы тэрыторыі чакаюцца дажджы, уначы і раніцай у асобных раёнах з мокрым снегам, таму месцамі магчымы галалёд. У асобных раёнах парывы ветру будуць дасягаць 15—18 м/с.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Здарэнне

# У МІНСКУ ПРАДУХІЛЕНЫ НАПАД НА ЛАМБАРД

**Упраўленнем Следчага камітэта па г. Мінску на падставе матэрыялаў МУС заведзена крымінальная справа ў дачыненні да грамадзяніна Расійскай Федэрацыі, які падазраецца ў падрыхтоўцы разбойнага нападу на адзін з ламбардаў сталіцы.**

Следствам устаноўлена, што жыхар Бранскай вобласці, 1971 года нараджэння, у пачатку кастрычніка распрацаваў план нападу. З мэтай яго ажыццяўлення набыў маску, электрашокер і пнеўматычны пісталет. Давесці злачынны намер да канца яму не дазволілі супрацоўнікі міліцыі, якія затрымалі падазронага на ўваходзе ў ламбард. У цяперашні час следчыя працуюць з затрыманым. Правяраецца інфармацыя аб магчымых дачыненні мужчыны да ўчынення аналагічных фактаў супрацьпраўнай дзейнасці. Следства мае намер хадайнічаць аб прымяненні да яго меры затрымання ў выглядзе заключэння пад варту.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Меркаванне

# ПРЫМУСАМ НІКОГА НЕ АШЧАСЛІВІШ

## Зноў пра аборты, і не толькі

**У Польшчы бязглуздая заканадаўчая ініцыятыва на поўную забарону абортаў выклікала хвалю пратэстаў. Пад націскам не толькі жаночай грамадскасці парламентарыі вымушаны былі адмовіцца ад намеру прыняць адпаведны закон. Але следам за палякамі актыўна загаварылі пра адмову ад абортаў як рэзерв паляпшэння дэмаграфіі ў Расіі. Не засталася без увагі тэма і ў нас. Хоць у нашай краіне як быццам бы гаворка пра забарону штучнага перарывання цяжарнасці не ідзе, але мяркуючы па апошніх перадачах на ТБ, публікацыях у СМІ, выспяваюць альбо прапіхваюцца невялікія іншыя папраўкі ў заканадаўства, да якіх таксама трэба паставіцца вельмі асцярожна. Каб не наламаць дроў, не пакалечыць лёсы, або як гавораць медыкі, не нашкодзіць.**



І для пачатку прывяду меркаванні па названай тэме розных жанчын, з якімі ўдалося пагутарыць за некалькі дзён.

**Альбіна ЧАРАНКЕВІЧ, акушэр-гінеколаг Брэсцкага абласнога радзільнага дома, урач з 42-гадовым стажам:**

— Найперш хачу адзначыць, што абортаў цяпер робіцца ў разы меней, чым раней. І гэта вынік асветніцкай, выхаваўчай работы, якую праводзяць урачы пры дапамозе работнікаў адукацыі і прадстаўнікоў грамадскасці. Гадоў трыццаць назад многія жанчыны разглядалі аборт ледзь не як сродак кантрацэпцыі. У нас былі пацыенткі, што прыходзілі на аперацыю па перарыванні цяжарнасці амаль кожны год. Нельга сказаць, што тады не было сродкаў і метадаў кантрацэпцыі. Не такія разнастайныя як цяпер, але яны былі. Проста ў жанчын бракавала пачуцця адказнасці і адказнасць у адносінах нават да свайго здароўя. Тым жа можна растлумачыць і крымінальныя аборты, з якімі мы сутыкаліся 30—35 гадоў таму. Аперацыя, як вядома, не была пад забаронай і тады. Але час ад часу нам даставілялі жанчыну ў найцяжэйшым стане, якой шляхам складанай аперацыі даводзілася ратаваць жыццё. Яшчэ на маёй памяці выпадкі, калі розныя шарлатаны спрабавалі выклікаць аборт фікусам, цыбуляй, вязальнымі пруткамі. Усё гэта рабілася не ў пару сівой даўніны, а ў час актыўных палётаў у космас, атамных ледаколаў і стапрацэнтнага ахопу тэрыторый радыё- і тэлевяшчаннем.

Таму апошнія два дзесяцігоддзі асветніцкая работа ў гэтым кірунку вялася з асаблівым напорам. І плады яе прыкметныя. Ну, нават калі ўзяць статыстыку, якая апошнім часам нярэдка прыводзіцца: калі ў 2000 годзе ў краіне на 1000 жанчын фертыльнага ўзросту рабілася 46 абортаў, то ў 2015-м такіх аперацый было 12,8. Як кажуць, адчуйце розніцу.

Але і гэтых 12 — многа, — працягвае Альбіна Аляксееўна. — Асабіста я стаўлюся адмоўна да такой сацыяльна-маральнай з'явы, як аборт. Бо праз мае рукі прайшлі дзясяткі, а то і сотні жанчын, якія доўга лячыліся, пакутавалі ад наступстваў названай аперацыі, асабліва тыя з іх, хто перарываў першую цяжарнасць. Бясплоднасць, запаленчыя захворванні і немагчымасць у рэшце рэшт нарадзіць дзіця — гэта гора для сям'і, трагедыя для самой жанчыны. І добра, што цяпер ёсць абавязковае псіхалагічнае кансультаванне тых, хто адважыўся пайсці на гэтую аперацыю.

**Не варта, як з віламі на паравоз, перціся з заканадаўчымі ініцыятывамі ў вельмі далікатную сферу чалавечага жыцця.**

Забароны ў гэтай справе да дабра не даводзяць. Забароны абавязкова прывядуць да дзікунства, якое ўжо аднойчы перадолелі — да крымінальных абортаў. Могуць і павялічыць статыстыку злачынстваў у дачыненні да нованароджаных. Нядаўна рэзананс атрымаў выпадак у Мачулішчах пад Мінскам, калі жанчына выкінула немаўля ў смеццеправод. Падобны аналагічны выпадак у Брэсце крыху больш за 10 гадоў таму. Таксама пасля нараджэння маці скінула дзяўчынку з 9-га паверха дома. На шчасце, малую выратавалі, урачы рэанімацыі далі ёй імя Вікторыя і прозвішча па дні тыдня, калі яе знайшлі. Апошнія — прыклады крыху іншага кірунку. Такім грамадзянкам не можа быць наогул ніякага апраўдання, у нас адпрацаваная сістэма адмовы ад непажаданых дзяцей, малое можна пакінуць у любой установе аховы здароўя... Трэба проста імкнуцца да таго, каб дзеці былі жаданыя.

**Святлана КАРОЛЬ, журналіст:**

— Я прыхільнік такой ідэалогіі: трэба нараджаць столькі дзяцей, колькі Бог дае. Аборт, як ні круці, з'яўляецца маленькім забойствам. Гавару так і лаўлю сябе на думцы, што гэта разважанні саракагадовай жанчыны, якая мае надзейны тыл у выглядзе добрай сям' і. Але ж у жыцці здараецца ўсяляк. І можна ўявіць сабе разгубленую, пакінутую маладую жанчыну, якой няма на каго абаперціся і няма ў каго шукаць спагады. Яна разумее, што сама не зможа выхаваць дзіця, даць яму добрыя ўмовы жыцця і прыстойную адукацыю. Скажаце, можна цывілізавана адмовіцца ад малога. Але не кожны здольны пасля нараджэння пакінуць сваю крывіначку ў бальніцы з адпаведнай заявай. І вось калі яна стаіць на мосце з такімі думкамі... Не ўсе ж у нас моцныя духам, пачаць з нуля і дабіцца ўсяго могуць толькі героі серыялаў, а ў жыцці, на жаль, здараецца зусім наадварот.

Таму я за такую забарону абортаў, якая выспее ў галаве кожнай жанчыны. І для гэтага па-мойму ў нашым грамадстве робіцца нямала. Можа, трэба рабіць яшчэ болей. Магчыма, варта выхоўваць адказнасць і мужчын за новае жыццё. Толькі не ведаю як.

**Галіна ЯФІМАВА, настаўніца на пенсіі, педагог з 38-гадовым стажам:**

— Хачу сказаць, што ў апошнія гады мы рабілі нямала для выхавання дзяўчынак як будучых маці. Як класны кіраўнік я не мінала выпадку, каб запрасіць на гутарку доктара. І спадзяюся, што мае выпускніцы многа ўзялі для сябе з тых класных гадзін, што мы, дарослыя, прымусілі іх думаць, разважаць менавіта аб адказнасці за свае паводзіны, будучую сям'ю і будучых дзяцей. А інфармацыі для роздуму яны атрымалі дастаткова. Але цяпер думаю: мы заўсёды гаварылі пра гэта з дзяўчынкамі, а вось у выхаванні хлопчыкаў нешта грунтоўнае ўпускаем. Пра апошняе сведчаць і тая лёгкасць, з якой многія маладыя людзі цяпер ставяцца да абортаў. Нядаўна героіня адной з тэлеперадач прапаноўвала заканадаўча замацаваць неабходнасць пісьмовай згоды на аборт бацькі магчымага будучага дзіцяці. Можа, гэта і ёсць той стымул, які ўскалыхне адказнасць. Бо да зараджэння новага жыцця маюць дачыненне два чалавекі, а мы ўвесь час гаворым толькі пра жанчыну.

* * *

Нехта, можа, зробіць заўвагу аўтару гэтых радкоў, чаму не папыталася пра меркаванне мужчын па тэме. Я пыталася, але не рызыкну прывесці іх, ва ўсялякім разе, цяпер. Бо іх трэба было б перакладаць на літаратурную мову, а лейтматыў іх агульны: пакіньце ў спакоі жанчыну, гэта найперш яе справа. Адзін найбольш рамантычны з апытаных працытаваў радок Марыны Цвятаевай: «Бог, не суди, ты не был женщиной на земле». І за гэта яму дзякуй.

Варта паглядзець на праблему больш пільна. Менавіта жанчына носіць у сабе дзіця дзевяць месяцаў, потым нараджае і пакуль яшчэ нярэдка гадуе, ставіць на ногі адна. Можна спытаць у медыкаў цэнтра «Тонус», дзе дапамагаюць хворым ад нараджэння дзеткам, колькі бацькоў сышло, яны не вынеслі цяжару жыцця ў сям'і з хворым дзіцем. І тады нясе гэты крыж адна жанчына. А можа, пытаць дазволу на аборт у алкаголікаў, сямейных гвалтаўнікоў, што робяць жыццё невыносным? Можа, наогул дайсці да абсурду, калі дзяўчына не вельмі «цяжкіх» паводзін будзе вымушаная плаціць грошы суб'екту з вуліцы, каб схадзіў з ёю ў паліклініку і напісаў патрэбны ліст. Таму не трэба ламаць дроў, не варта, як з віламі на паравоз, перціся з заканадаўчымі ініцыятывамі ў вельмі далікатную сферу чалавечага жыцця. Рашэнне нармальнай жанчыны на гэты конт, паверце, і так выплакана і выпакутавана. Трэба ёй падставіць плячо, калі яна вагаецца, а не прымушаць ды пужаць забаронамі. Розных прымусаў і забарон у нас і так хапае.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
yackevich@zviazda.by

■ Неасабісты суб'ектыў

# Вясковыя дачнікі



## Замест «паеду дадому» мы цяпер кажам: «Паеду на лецішча»

НЯДАЎНА злавіла сябе на словах, ад якіх праз імгненне аж скаланулася душа. Упершыню за ўсё жыццё, гаворачы са знаёмымі пра планы на выхадныя, замест «паеду дадому», вымавіла: «Паеду на лецішча». Як яно так вырвалася — сама не заўважыла. Магчыма, гэта было ўжо падсвядомае жаданне наваспечанага гараджаніна засведчыць, што, акрамя апартаментаў у сталіцы, маеш і «домік у вёсцы» — гэткае сведчанне дабрабыту ў нашым тыповым разуменні. А можа, роспачнае ўсведамленне, што родная хата, у якой вырасла не адно пакаленне, сапраўды ператвараецца ў дачу і, знямелая і адубелая, замірае, шырока расплюшчыўшы аканіцы, да наступнай вясны...

Вы ўвогуле не заўважалі, што зімой, а асабліва такой настылай, як сёлета, ранняй восенню, сапраўдныя дачныя домікі (невялікія, як лялечныя, у іх нават і печы талковай няма) зусім не выклікаюць уражання пакінутасці. Стаяць сабе і стаяць, чакаюць цёплага надвор'я, ці Новага года, ці летніх выхадных, калі прымчыцца з горада шумная кампанія, распаліць мангал, што стаіць у альтанцы, будзе святкаваць і весяліцца... Дзеля гэтага, уласна, і будаваліся. (Ну, яшчэ, канешне, і дзеля агарода, на якім і агуркі-памідоры, і кветкі, але тут размова пра іншае.) У іх усё сезоннае: і мэбля, і посуд, і гардэроб гаспадароў. Не абцяжараныя рэчамі і ўспамінамі, гэтыя невялікія «шпакоўні» нават сярод восеньскай слаты выглядаюць бадзёра і нават крыху легкадумна.

ІНШАЯ справа — сапраўдныя вясковыя хаты, якія сталі звацца лецішчамі воляй лёсу. Гаспадары або сышлі ў іншы свет, або, састарэлыя і нямоглыя, пераязджаюць да дзяцей у горад. Збудаваныя для вялікай сям'і, з цяжкой дыхтоўнай мэбляй, якая куплялася да прададзеных парасят ці ў растэрміноўку, з цьмяным крышталём у старых сервантах, з шафамі, забітымі адзеннем на ўсе сезоны, з настылай вялікай печчу, якая, ад таго што не паліцца зімой, патухае вільгаццю нават у самыя гарачыя летнія дні, гэтыя хаты выглядаюць літаральна асірацелымі.

Гэтаксама як і наваспечаныя дачнікі, якія ўжо прыязджаюць не «дадому», а «на лецішча». Бльндаеш па двары, зграбаеш пасівералае лісце, топчаш у садзе нікім не пазбіраныя яблыкі, а ў хату ісці не хочаш. Бо там холадна і вусцішна, і не пахне, як калісьці, чымсьці смачным, і не прыкладзеш, прыйшоўшы з вуліцы, адубелыя рукі да цёплай грубкі — яна гэткая самая адубелая. Паробіш, што трэба, каля хаты, пазамыкаеш усё на цяжкія замкі — і хутчэй у горад, да цяпла, да людзей. Але ж хіба ўцячэш ад думак, ад успамінаў, ад самога сябе, у рэшце рэшт?..

СЁЛЕТА, забіраючы маму ў горад на зіму, я разам з усімі нашымі пераезнымі клункамі ды валізкамі забрала старыя фотаальбомы. Цяжкія, у цёмных скураных пераплётах, яны ляжалі на сваім месцы ў серванце яшчэ задоўга да майго нараджэння, былі самай таямнічай, самай неад'емнай часткай роднай хаты. Я доўга не рашалася везці гэтыя фаліянты ў Мінск: здавалася, зраблю нешта непапраўнае, незваротнае, адніму ў хаты яе душу. Але сёлета ўсё ж наважылася, бо ад халоднай вільгаці старыя, некаторыя нават даваенныя, фоткі пачалі псавацца.

Цяпер яны, перабраныя і акуратна складзеныя, перагледжаныя і падпісаныя мамай (бо многіх сваякоў, што на іх, мы, дзеці, ужо і не ведаем, што казаць тады пра ўнукаў і праўнукаў) знайшлі сваё месца за шклом на паліцы. Дзяды-бабулі, цёткі-дзядзькі, дзеці-ўнукі (ад калыскі да вяселля) цяпер пастаянныя жыхары ў маёй кватэры. А праз колькі дзён у мяне ўпершыню вырвалася не «дадому», а «на лецішча».

Засталіся яшчэ кнігі. Не адна, пэўна, сотня. Але, нягледзячы на тое, што і ім пагражае вільгаць, забіраць іх пакуль не асмельваюся. Забраць — гэта значыць назаўжды пазбавіць сябе, сястру, пляменніц, якія прыязджаюць улетку, магчымасці ўзяць з паліцы, дзе яны стаяць ужо гадоў трыццаць, Дзюма ці Маўра, разгарнуць наўгад... — і зачытаўшыся, як у дзяцінстве, на імгненне злавіць у бяздзеі сусвету ўльтрахвалю бесклапотнага шчасця...

А позняй восенню, прымчаўшы на выхадныя, зноў будзеш зграбаць скрабачанае ад холаду лісце, што абляцела са старога клёна, разгублена хадзіць па падворку, навешваць цяжкія замкі на дзверы, спрабаваць жартаваць з суседам, які гэтаксама ходзіць каля роднай хаты, нібы згубіўшы і шукаючы штосьці. І глядзець, як у ранніх прыцемках ледзь не ад кожнай брамкі на доўгай вуліцы ад'язджаюць на машынах у бок вялікага горада твае былыя аднавяскоўцы, навасечаныя дачнікі...

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** alena@zviazda.by

■ Сямейны праект

# Хто будзе «Уладаром сяла»?

## Гэта стане вядома ў суботу падчас фіналу конкурсу

**Мерапрыемства пройдзе ў аграгарадку Дукора Пухавіцкага раёна. Галоўныя героі рэспубліканскага фіналу папулярнага маладзёжнага праекта — шэсць сем'яў з розных куткоў краіны — пераможцы раённых і абласных этапаў конкурсу. Разам са сваімі дзецьмі яны паспаборнічаюць за тытул «Уладар сяла 2016» у творчых і сельскагаспадарчых конкурсах.**

Напрыклад, падчас прэзентацыі «Гаспадар сяла» ўдзельнікі фіналу прадэманструюць прадметы сямейнай творчасці (вязанне, выпечка, ігра на інструментах, складанне вершаў, спевы, выкананне танцаў, гульня з дзецьмі і г.д.), а таксама свае запасы, прыгатаваныя да зімы (гародніна, нарыхтоўкі і г.д.). На пляцоўцы «Працуем» фіналісты праявяць свой спрыт у колцы і складванні дроў (конкурс «Па дровы»), сельскагаспадарчай «Вясковай эстафеце» (хуткаснае сартаванне ўраджаю, уменне абыходзіцца з вілкамі і каромыслам, валоданне малатком (жаночая палова), а таксама іголкай і ніткамі (кіраўнік сям'і), паспаборнічаюць ва ўменні запрэгчы-распрэгчы каня (конкурс «Святочны воз»).

Упершыню ў праграму ўключаны конкурс «Лепшы гаспадар». Мужчыны з майстрам-кавалём у майстэрні будуць чаканіць манеты, а іх жонкі пад кіраўніцтвам майстра-свечніка створаць эксклюзіўныя свечкі. А вось вырабіць у ганчарнай майстэрні сямейны абярэг сваімі рукамі трэба будзе разам.

Напрыканцы пераможцаў і ўдзельнікаў фіналу рэспубліканскага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Уладар сяла 2016» чакаюць прызы і падарункі: ганаровыя дыпломы з грашовымі прэміямі ў памеры 80 базавых велічынь кожнаму фіналісту, а таксама бытавая тэхніка і іншыя сюрпрызы .

Ідэйным натхняльнікам праекта з 2008 года выступае грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Праект атрымаў «прапіску» ва ўсіх рэгіёнах краіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

■ Па-за кадрам

# Мазаіка жыццёвай гармоніі

## Хто і як дапамагае беларусам гаіць душэўныя раны ў тэлеэфіры?


Канстанцін Даўлатаў і Міраніка Март.

**У нас пакуль што не прыжылася традыцыя вырашаць тыя ці іншыя праблемы разам з псіхолагам. Беларусы збольшага прызвычаіліся цярпець — хіба самым блізкім паскардзяцца, а вось па дапамогу да спецыялістаў звяртаюцца, калі, што называецца, ужо зусім край... Між тым, боль у душы — такі ж самы непарадак, як боль цялесны, і трэба не цярпець, а высвятляць яго прычыны і шукаць спосабы пазбаўлення, сцвярджаюць стваральнікі першага ў Беларусі тэлевізійнага псіхалагічнага рэаліці «Усё складзецца». Першыя выпускі выйшлі на АНТ яшчэ ў чэрвені, а ў кастрычніку стартаваў новы сезон. І, трэба адзначыць, пасля працяглых летніх канікулаў цікавасць гледачоў да праграмы не зменшылася, а колькасць ахвотных паўдзельнічаць у ёй пераваліла за 90. Наколькі выніковай аказваецца тэрапія пад прыцэлам мноства тэлекамер, хто гатовы адкрыта гаварыць пра свае праблемы на ўсю краіну, і як адгукаюцца гэтыя словы ў далейшым жыцці, «Звяздзе» расказалі сцэнарыст, рэдактар і сувядучая праграмы Міраніка МАРТ і прадзюсар праекта Валерыя ЛЯДЗЯЕВА.**

***— Многія замежнікі адзначаюць, што беларусы — даволі закрытыя людзі, і ў нас не прынята несці свае праблемы да псіхолага. Адкуль жа бяруцца людзі, гатовыя раскрыць душу перад усёй краінай, і ці многа іх наогул?***

— Гэта сапраўды так, — пагаджаецца Міраніка Март, — у Беларусі толькі-толькі пачынае развівацца культура звароту да псіхолага. Многія ж церпяць да той пары, пакуль не робіцца невыносна, і нават тады не ўпэўнены: прыйсці да псіхолага — гэта вельмі сорамна або не? Але недахопу ў героях у нас няма — пасля першых жа эфіраў паступілі дзясяткі заявак, у тым ліку і з-за межаў Беларусі — з Расіі, Польшчы; прычым для многіх людзей гэта літаральна апошні шанц. Мы заўжды зыходзім з прынцыпу «не нашкодзь», таму папярэдне праводзім дастаткова вялікую работу з кожным патэнцыйным удзельнікам праграмы — у некаторых з іх знікае патрэба ў сеансе, бо яшчэ на стадыі гутаркі чалавек знайшоў выйсце; у іншых, наадварот, аказваецца настолькі складаны выпадак, што публічнасць яму толькі пашкодзіла б, бо тут патрэбны шэраг кансультацый тэт-а-тэт.

Спектр праблем, з якімі людзі звяртаюцца ў праграму, самы шырокі: немагчымасць наладзіць асабістае жыццё, застарэлы боль ад страты блізкага чалавека, павышаны ўзровень агрэсіўнасці ў стасунках з навакольнымі, непрыняцце ўласнага цела, здрада каханага, «комплекс ахвяры» ці адчуванне сябе няўдачнікам — словам, многія з нас, пры жаданні, змогуць пазнаць у героях сябе. А потым — зноў жа, пры жаданні — для вяртання ўнутранай гармоніі скарыстацца метадамі, якія прапануюць прафесіяналы.



**Часам выйсце з невырашальнай сітуацыі аказваецца настолькі простым, што многім не верыцца. «Ведаеце, гэта як з электрычнай разеткай: калі засунуць у яе пальцы, цябе гарантавана б'е токам. Некаторыя людзі спрабуюць вывучаць прыроду тока, іншыя бачаць у кожнай разетцы кармічнае пакаранне... А трэба ўсяго толькі перастаць засоўваць у яе пальцы!»**

— Безумоўна, мы не займаемся хваробамі, якія мусіць лячыць псіхіятрыя, а працуем са звычайнымі людзьмі, у якіх здарыліся пэўныя перакосы і з-за гэтага пагоршылася якасць жыцця, — зазначае Міраніка Март. — Напрыклад, паводле тэорыі сямейных расстановак, на лёс чалавека ўплываюць папярэднія пакаленні, і многія нашы цяжкасці звязаны з траўмамі, перанесенымі ў мінулым, таму для вырашэння праблем трэба перанесціся зноў у гэта мінулае і расставіць усё па належных месцах. Яшчэ адзін важны момант, чаму мы вучым людзей (і вучымся самі па ходу работы), — адэкватна назваць свае эмоцыі, не саромецца, а прыняць іх. Часта героі даведваюцца аб сабе даволі непрыемныя рэчы, аднак уласцівасць лекаў — быць горкімі, і гэта трэба перажыць. Дарэчы, самі здымкі ўзмацняюць тэрапеўтычны эфект, чалавек пражывае сітуацыю некалькі разоў: спачатку, калі прыходзіць да нас на папярэдняе інтэрв'ю, дзе збіраецца падрабязны «анамнез» і складаецца стратэгія работы, потым непасрэдна падчас здымак і стасункаў з псіхолагам і трэці раз — калі глядзіць праграму ў эфіры.

Сеанс работы герояў з псіхолагам доўжыцца больш за гадзіну, а ў эфіры застаецца ўсяго 15-20 хвілін — тэлевізійны фармат абавязвае. Рэдактар «выразае», як правіла, працэс настройкі, глыбока інтымныя рэчы з жыцця героя, а таксама тэхнічныя моманты, цікавыя толькі прафесіяналам. Аднак самыя яркія эмоцыі ўдзельнікаў і сутнасць праблемнай сітуацыі, безумоўна, застаюцца ў праграме. Акрамя таго, употай ад

**«Няма паняцця «праблема», ёсць успрыманне жыцця як праблемы, — мяркуе вядучы праекта, псіхолаг Канстанцін Даўлатаў. — Трэба проста зразумець, з якога боку ты глядзіш на рэчы».**

герояў аўтары шукаюць адсутныя элементы «пазла» душэўнай раўнавагі; скажам, камусьці вельмі не хапае бацькоўскай любові і проста пахвалы — і тэлевізійнікі запісваюць сюжэт, у якім бацькі ці іншыя блізкія людзі гавораць гэтыя важныя рэчы.

***— Наколькі ўдаецца прытрымлівацца сцэнарыя — ці ўся работа заснавана на імправізацыі і залежыць ад паводзін героя?***

— Да пачатку здымак ёсць гіпотэзы развіцця сітуацыі, іх ад трох да пяці, і па якой лініі мы пойдзем, абсалютна невядома, бо гэта залежыць ад тэрапіі, ад таго, як будзе на яе рэагаваць кліент, — тлумачыць прадзюсар Валерыя Лядзяева. — Праект атрымліваецца неймаверна жывы, і ў гэтым яго асаблівае хараство: мы ў рэжыме рэальнага часу назіраем за трансфармацыяй чалавека, спачуваем яму. Для сябе я зразумела, што шлях паказваецца кожнаму, але не кожны гатовы яго прыняць: ёсць людзі, якім прасцей працягваць рухацца па наезджанай каляіне, чым змяніць штосьці ў жыцці. Будаваць нешта новае — для гэтага трэба мець унутраную сталасць, смеласць і запас сіл, каб не збегчы ў апошні момант.

### Даведка «Звязды»

**«Усё складзецца» — тэлевізійнае псіхалагічнае рэаліці, гэта значыць у праграме няма пастановачных здымак: толькі рэальныя людзі, толькі сапраўдныя гісторыі і натуральныя эмоцыі. Стваральнікі адмыслова адкінулі частку «шоу», бо ў праграмы ні ў якім выпадку не забаўляльны, хутчэй, асветніцкі кірунак.**

**На «ценявым баку» студыі героі разам з псіхолагам, псіхатэрапеўтам, кандыдатам псіхалагічных навук Канстанцінам Даўлатавым крок за крокам аналізуюць прычыны сваіх няўдач, а на «светлым баку» дзеляцца з сувядучай праекта Міранікай Март уражаннямі ад праведзенай работы. «Мы імкнёмся паказаць у эфіры механізмы рашэння даволі частых праблем, абумоўленых распаўсюджанымі стэрэатыпамі мыслення, а таксама прадэманстраваць працэс трансфармацыі героя на гэтым шляху», — тлумачаць аўтары праекта.**

— Наш праект — не «У гасцях у казкі», — дадае Міраніка Март, — і няма такога, што прыйшоў чараўнік і зрабіў усё за вас. Чалавеку неабходна працаваць са сваімі перажываннямі самому, і прытым выразна ўсведамляць, якой мэты ён хоча дасягнуць і як шмат давядзецца для гэтага зрабіць.

***— Ці сочыце вы за лёсам герояў пасля праграмы і якія водгукі ад іх атрымліваеце?***

— Так, мы падтрымліваем зваротную сувязь і сочым, як уплывае на іх лёс узрушэнне, якое адбылося падчас сеансу работы з псіхолагам. Большасць адчуваюць зрухі да лепшага і шчыра дзякуюць нам. Многіх «накрывае» ўжо на праграме — відаць, як змяняецца постаць чалавека, выраз твару, нават стан скуры! А некаторых як быццам чуе космас і дае менавіта тое, чаго яны просяць: так, адна наша гераіня на працягу 6 гадоў пасля разводу з мужам працягвала жыць з ім і трыма дзецьмі ў адной кватэры, бо не было куды з'ехаць, цярпела яго тыранію і не бачыла выйсця з тупіка, хоць бясконца вучылася, у тым ліку прайшла шэраг псіхалагічных трэнінгаў. Што б вы думалі — праз тыдзень пасля здымак яна напісала мне: «Павіншуй, я шчаслівая ўладальніца 2-пакаёўкі, здзелка адбылася!» — цытуе прадзюсар урыўкі з перапіскі, — знайшоўся пакупнік, гатовы пагасіць крэдыт, дачакацца завяршэння ўсіх папяровых працэдур, і ў гэтай зацягнутай гісторыі нарэшце з'явілася тлустая кропка.

У прафесійным асяродку праект успрынялі неадназначна: адны псіхолагі яго стрымана хваляць, другія, пераважна псіхатэрапеўты, для якіх кожная сустрэча з кліентам — гэта грошы, відавочна раўнуюць... «Не, у нас з Канстанцінам Даўлатавым гэтай рэўнасці няма, бо мы робім адну справу, проста адказваем за розныя яе ўчасткі, — усміхаецца ў адказ на маё пытанне Міраніка Март, таксама псіхолаг па адукацыі. — Наадварот, мне заўжды цікава зразумець, чаму ён абраў менавіта такі спосаб, каб раскрыць глыбінную сутнасць чалавека. І ў нашым дыялогу Канстанцін якраз раскрывае мне і гледачам некаторыя нюансы».

Патрэба ў псіхалагічных тэлекансультацыях, здаецца, немалая: на гэты момант у «лісце чакання» на ўдзел у праграме каля 70 заявак, прычым многія пішуць не ўпершыню. «Мы знялі ўжо 3 сезоны рэаліці (у кожным сезоне па 6 выпускаў), неўзабаве прыступім да чацвёртага. Наогул «Усё складзецца» будзе ў эфіры АНТ як мінімум да канца мая», — дзеліцца планамі Валерыя Лядзяева.

**«Дазволіць сабе адчуць і перажыць эмоцыі вельмі важна. Адна з нашых гераінь пакутавала ад таго, што некалі яе, цяжарную, кінуў каханы і завёў адносіны з суседкай. Яна доўга моўчкі ўсё гэта назірала. Канстанцін Даўлатаў прапанаваў: уяві, што перад табой сядзіць былы каханы, і скажы, што ты адчуваеш. Дзяўчына ўважліва паглядзела на пустое крэсла і выдала: «Фёдар, ты казёл!» Мы ўсе літаральна спаўзлі на падлогу — а дзяўчына прызналася, што ёй стала значна лягчэй, нават дыхаецца па-іншаму».**

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**


Фота прадакшн-студыі «MediaCube».

# ХТО РАНА ЎСТАЕ...

**Што: анімацыйны фільм «Кніга легендаў. Таямнічы лес»**
**Калі і дзе: Беларусь 3, 24 кастрычніка ў 7.55**



Першы казахстанскі фільм у папулярным апошнім часам жанры фэнтэзі, зроблены з выкарыстаннем анімацыі і камп'ютарнай графікі.

Сюжэт яго стваральнікі, трэба адзначыць, прыдумалі нетрывіяльны. Сыны вядомага бізнесмена Баха і Таха растуць з мачахай і не маюць паразумення з бацькам. Хлопцы вельмі любяць прыгоды і дзякуючы неўтаймоўнай фантазіі і хуліганскаму настрою часта іх знаходзяць. Аднойчы, прачытаўшы ў кнізе пра царыцу амазонак, якая змагаецца супраць сіл зла, яны без лішніх роздумаў адпраўляюцца ў казачны лес, каб дапамагчы ёй, а ўзамен папрасіць ажывіць маці і вярнуць бацькаву ўвагу. Тым часам мачаха, якую дапяклі выхадкі пасынкаў, наймае двух бандытаў для выкрадання хлопчыкаў...

**Што: меладрама «Снежаньскія хлопчыкі»**
**Калі і дзе: TV1000, 25 кастрычніка ў 6.10 і 18.15**



Чым гэты аўстралійскі фільм можа прыманіць гледачоў яшчэ да прагляду? Напрыклад, акцёрам Дэніэлам Рэдкліфам, які вырваўся з вобраза Гары Потэра і не менш пераканаўча сыграў іншага, зусім звычайнага хлопчыка-сірату.

Насамрэч гэтых хлопцаў чацвёра, усе яны сіроты і ўсе нарадзіліся ў снежні. Чым далей яны растуць, тым менш у іх застаецца шанцаў трапіць з дзіцячага дома ў сям'ю. Але аднойчы кампанія сяброў знаёміцца з маладой парай, якая не можа мець дзяцей і хацела б усынавіць хлопчыка — але толькі аднаго. Прыёмныя бацькі — гэта запаветная мара кожнага з чатырох герояў. Іх сяброўства пройдзе сур'ёзную праверку на трываласць, а калі ў справу ўмешваюцца яшчэ непаўторныя эмоцыі першага кахання — абсалютна немагчыма прадказаць, якім будзе фінал.

**Што: дэтэктыў «Два доўгія гудкі ў тумане»**
**Калі і дзе: СТБ, 29 кастрычніка ў 8.00**



Класічны вострасюжэтны савецкі дэтэктыў, выкананы ў найлепшых традыцыях Агаты Крысці: замкнёная прастора, невялікая колькасць дзеючых асоб, і як быццам усё відавочна, але да апошняга моманту сумняваешся, хто злачынца.

Поўнач СССР, 1980-я гады. Гідрасамалёт, які перавозіў вялікую суму грошай, з тэхнічных прычын вымушаны зрабіць незапланаваную пасадку на возеры Аяк. Нечакана наляцеў шквалісты вецер, які аднёс на вадзе судна без экіпажа — пры гэтым загінуў інкасатар. Невядомы злачынца знайшоў і спаліў самалёт, забраў частку грошай, а таксама забіў выпадковага сведку-геолага. Прыкладна ў гэты ж час цеплаход «Анадыр» усяго з некалькімі пасажырамі выконвае апошні рэйс перад зімовым ледаставам. З-за густога туману карабель спыняецца пасярод ракі і пераыдачны дае два доўгія гудкі, каб не сутыкнуцца з іншымі суднамі ■

## Панядзелак, 24 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.20** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Клуб рэдактараў.
**11.00, 13.05 Серыял «Хлусня дзеля выратавання». 1—4-я серыі.**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 16.30 Серыял «Сваты-6».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** «Форум» з Дзмітрыем Бачковым.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**0.00** Дзень спорту.
**0.10 Серыял «Мечаны».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 9.55, 19.05** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00 Дэтэктыў «Такая работа».**
**10.30, 17.50 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**11.35** Сіткам «Розныя».
**13.05** Два рублі.
**13.20 Серыял «Косці».**
**16.50, 23.20 Дэтэктыў «Падмані мяне 3».**
**19.15** Суперлато.
**21.10** «Сям'я». Рэаліці-шоу.
**22.00** КЕНО.
**22.25** Рэпарцёр.
**0.20 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 13.20, 18.15, 21.00** Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**7.50** «Размаўляем па-беларуску».
**7.55 «Кніга легендаў. Таямнічы лес». Камедыя.**
**9.20, 20.00** «Раўнавага страху. Вайна, якая засталася халоднай». «Гарачая лінія» халоднай вайны».
**9.55 «Папярэднее расследаванне». Прыгоды.**
**11.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**12.20** «Наперад у мінулае».
**12.45** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.35** «Музеі Беларусі». Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі.
**14.00** «Час кіно».
**14.10 «Жаніх для Лауры». Камедыя.**
**15.40 «Мама, я жывы». Драма.**
**16.45 «6:3». Камедыя.**
**18.35, 22.30** «Ды@блог». Пра літаратуру.
**19.00 «Гваздзік». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.15 «Дрэвы на асфальце». Меладрама.**
*На тэлеканале «Беларусь 3» з 24 па 30 кастрычніка 2016 г. з 19.00 да 20.00 па Брэсцкай і Гомельскай абласцях будуць трансляваца абласныя тэлепраграмы.*

### Беларусь 5

**7.45, 18.45** PRO спорт. Навіны.
**7.55, 14.30, 22.10** Тэніс. WTA. Выніковы турнір. Сінгапур.
**12.05** На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**12.35** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — ХК «Сочы».
**18.55** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — «Дарожнік» (Фаніпаль).
**20.40** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**21.25** Час футбола.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 (з субцітрамі), 8.30, 9.00 (з субцітрамі), 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10 Серыял «Практыка».**
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15** «Голас». Спецыяльны выпуск.
**1.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05** Канцэрт Міхаіла Задорнава.



**15.30 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тайны Чапман».
**23.55 Маст. фільм «Мужчыны».**

### МІР

**7.00, 2.25** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Чорныя ваўкі».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Чаму я?»
**13.45 Маст. фільм «Як тры мушкецёры».**
**16.10** Ток-шоу «Слова за словам».
**17.05, 4.25 Серыял «Чалавек-прынада».**
**19.20 Серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка».**
**22.00 Маст. фільм «Цяжка быць мача».**
**23.45 Маст. фільм «Помста і закон».**
**2.55 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.40** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Сваты».**
**19.10, 20.40 Серыял «Заступніца».**
**21.45, 23.10 Серыял «Маскоўская барзая».**
**0.15** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.30** «Студыя Юліі Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 23.05** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00** «Новыя рускія сенсацыі».
**15.00** «Ты не паверыш!»
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Профіль забойцы».**
**21.25 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00** «Пазнякоў».
**0.10** НТБ-бачанне. «Куды сыходзіць дзяцінства?»

### 8 канал

**6.30** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Камедыя «На мора».**
**12.30** Дак. серыял «Межы магчымага».
**13.15 Серыял «Станіца».**
**14.10 Трылер «Паветраны маршал».**



**15.55, 19.05, 21.10, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.30** «Апавяданні пра жывёл».
**17.25 Серыял «Жаночы дэтэктыў».**
**18.10, 19.10, 21.05** «Хатняя крама».
**18.15 Серыял «Фартыцьюд».**
**19.15 Серыял «Напалеон».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Ю-571».**
**23.05 Серыял «Закон і парадак».**

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10, 14.20** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Вароніны».
**9.30** Фантастыка «Пяты элемент».
**11.50, 23.30** «Уральскія пельмені».
**12.10, 20.20** Серыял «Мамачкі 2».
**13.20** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.40, 5.00** Серыял «Косці».
**15.50, 19.10** Серыял «Маладзёжка 4».
**21.30** Камедыя «Бландзінка з амбіцыямі».
**0.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**1.00** Серыял «Бязмоўны сведка».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**4.00** «Лаві момант».

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** «Бібліятэка прыгод».
**11.30** «Завяшчанне прафесара Доўэля». Маст. фільм.
**13.05** «Лінія жыцця». Яўген Еўтушэнка.
**14.00, 18.30, 1.30, 2.35** Сусветныя скарбы.
**14.15** «Фёдар Літке. «Нядрэмлючы, я служу!» Дак. фільм.
**15.10** «Летась у Марыенбадзе». Маст. фільм.
**16.45** «Шарль Кулон». Дак. фільм.
**16.50** «Эпоха Аркадзя Райкіна». Дак. фільм.
**17.35, 1.40** Да 90-годдзя з дня нараджэння спявачкі. Галіна Вішнеўская і Мсціслаў Растраповіч. Канцэрт у Вялікай зале Маскоўскай кансерваторыі. Запіс 1964 года.
**18.45** «Містыка кахання». «Васіль Жукоўскі і Марыя Пратасава».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Сацi. Нясумная класіка...»
**20.45** «Правілы жыцця».
**21.10** 85 гадоў Сафіі Губайдулінай. «Сад радасці ў свеце смутку». Дак. фільм.
**22.00** «Тым часам».
**22.45** Рэпартажы іх будучыні. «Разумныя дамы». Дак. фільм.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** «Чаму сабакі не ходзяць у музей, або Пазітыўны погляд на сучаснае мастацтва». Дак. фільм.
**0.35** А. Чайкоўскі. Элегія (памяці Ц.М. Хрэннікава) і Вальс для аркестра.
**0.50** «Уголас». Паэзія сёння.

### Настальгія

**6.00** «Тэма» з У. Лісцьевым: «Праблемы платнай медыцыны». 1992 год.
**6.40, 8.35, 12.55, 14.30, 17.45, 19.00, 21.40, 23.00, 1.40, 2.45, 3.40, 5.15** Музычная настальгія.
**7.20** «Зямля—Паветра». «Прэмьер-министр». 2003 год.
**9.00** «Быў час». 2008 год.
**10.00** Маст. фільм «Мёртвы сезон».
**12.15** «Акулы пяра». Прафесар Лебядзінскі і група «Русский размер».
**13.20** Маст. фільм «У маёй смерці прашу вінавацiць Клаву К.»
**15.00** Тэлеспектакль «Шалёны дзень, або Жаніцьба Фігара». 1973 год.
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Міжнародная панарама». 2005 год.
**19.20** Маст. фільм «Маналог».
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаны ў СССР».
**23.20** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Раман Карцаў.
**0.00** «КВЗ-87». НДУ—ДДУ.
**1.50** Тэлеспектакль «Джэнтльмены, якім не пашанцавала». 1977 год.
**4.00** «Колба часу».
**5.00** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год.

### EuroSport 1

**5.30** Велаcпорт. Чэмпіянат Еўропы (трэк).
**7.00, 20.30, 14.30, 20.30, 1.45** Снукер. International Championship.
**12.30** Настольны тэніс. Чэмпіянат Еўропы. Фіналы.
**14.00, 19.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**17.30** Фігурнае катанне. Гран-пры. Skate America.
**21.45** Watts.
**22.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**23.00, 2.30** Футбол. Чэмпіянат MLS. Найлепшыя моманты.
**23.30** Футбол. «ФІФА».
**0.00** «Найлепшае з коннага спорту».
**0.15** Конны спорт. Кубак свету.
**1.15** Конны спорт. Royal Tour.

### Кінакамедыя

**0.10** Камедыя «Праект «А».
**1.55** Камедыя «Праект «А»: частка другая».
**3.45, 14.00, 14.55, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**4.00** Меладрама «Сведка на вяселлі».
**5.40** Камедыя «Каханне ад усіх хвароб».
**7.35** Меладрама «Красуні».
**9.15** Камедыя «Усё магу».
**10.50** Меладрама «Палавое выхаванне».
**12.30** Меладрама «Шчаслівае сямейства».
**14.15, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Вялікі Джым».
**17.50** Камедыя «Няголены нянь».
**19.30** Камедыя «Сёння ў меню».
**21.15** Меладрама «Справа ў табе».
**22.55** Камедыя «Кухар на колах».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Доктар І...»
**8.25, 18.50, 2.45** «Асколкі». Серыял.
**10.05** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.50** «Асцярожна, махляры!»
**12.20** «Без падману».
**13.10** «Давайце пазнаёмімся». Меладрама.
**15.00** «Вакол свету. Месцы сілы».
**15.55** «Паненка-сялянка».
**16.55** «Каханне ў савецкім кіно». Дак. фільм.
**17.50** «Тайны следства». Серыял.
**20.45, 2.05** «Ежа, я люблю цябе».
**21.35** «Рэвізора».
**22.35** «Гісторыі выратавання».
**23.10** «Звышнатуральнае». Серыял.
**23.55** «Вострaў праклятых». Трылер.
**4.20** «Нераскрытыя тайны».
**5.05** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.10, 13.30** Камедыя «Шэф Адам Джонс».
**7.55** Трылер «Улада страху».
**10.00** Фэнтэзі «Як зладзіць монстра».
**11.40** Драма «Быць Флінам».
**15.20** М/ф «Труп нявесты».
**16.45** Фэнтэзі «Уладар пярсцёнкаў: вяртанне Караля».
**20.10** Драма «Мой анёл-ахоўнік».
**22.10** Трылер «Версія».
**0.25** Фантастыка «Па-за часам».
**2.20** Драма «Спакуса».
**4.30** Трылер «Драйвер на ноч».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Кромаў».
**8.30** Камедыя «Увесь гэты джэм».
**10.20** Камедыя «8 новых спатканняў».
**12.10** Драма «Дзюба-Дзюба».
**14.35** Драма «Мама».
**16.25** Трылер «Юлечка».
**18.15** Драма «Дурань».
**20.20** Меладрама «На свеце жывуць добрыя і харошыя людзі».
**22.20** Серыял «Купрын. Упоцемку».
**0.20** Драма «Мужчынскі сезон: Аксамітная рэвалюцыя».
**2.30** Меладрама «Каханне напракат».
**4.20** Драма «Пахавайце мяне за плінтусам».

### National Geographic

**6.00** Прарыў.
**6.50** Код небяспекі.
**7.10, 13.25, 20.10, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 14.55, 21.00, 0.50, 4.00** Злавіць кантрабандыста.
**8.45, 15.40, 21.45, 1.40, 4.50** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**9.30** Твар у твар.
**10.20** Крытычная сітуацыя.
**11.05** Ледзяная дарога.
**11.55, 14.10, 19.30, 23.20, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**12.40** Чалавек супраць YouTube.
**16.30, 22.30** Ліній Наска.
**17.10** Твар у твар.
**18.00** Крытычная сітуацыя.
**18.40, 2.30** Сапраўдны геній.
**0.05** Уваванне на Зямлю.

### Discovery

**8.00, 14.00** Аляска: сям'я з лесу.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Багажныя войны.
**11.00** Востраў.
**12.00** Выжыць разам.
**13.00** Голыя і напалоханыя.
**17.00** Пешшу ўздоўж Ніла.
**22.00, 2.55** Махінатары.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 6.20** Салдаты няўдачы.
**1.30, 6.45** Хаос у дзяленні.
**2.00, 4.40** Самагоншчыкі.

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск №3

Сённяшні госць нашага шахматнага клуба — брэсцкі шахматыст Віктар Жук.

Віктар Мікалаевіч нарадзіўся ў 1955 годзе ў вёсцы Баяры Пружанскага раёна. Скончыўшы педагагічны інстытут, працаваў настаўнікам на Пружаншчыне, а пазней пераехаў у Брэст, супрацоўнічаў у абласных выданнях. Апрача практычнай гульні ў шахматы, захапіўся складаннем шахматных задач і эцюдаў. Апублікаваў некалькі сотань кампазіцый. Вёў шахматныя аддзелы ў шэрагу газет, зладзіў не адзін дзясятак конкурсаў складання, у якіх бралі ўдзел вядомыя шахматныя кампазітары Беларусі і замежжа. А яшчэ Віктар Жук выпусціў некалькі брашур, прысвечаных шахматам у Брэсце і Брэсцкай вобласці — пра іх гісторыю і сённяшні дзень, вядучых шахматыстаў і простых аматараў, пра тых, хто гуляе ў шахматы завочна і хто складае кампазіцыі. Атрымалася своеасаблівая рэгіянальная шахматная «энцыклапедыя».

* * *

Дарэчы, з Брэсцкай вобласці паходзяць многія вядомыя беларускія гросмайстры і майстры. Сярод іх — ураджэнец Кобрына Аляксей Аляксандраў. Вось адна з яго партый.

**Ф. Аманатаў (Расія) — А. Аляксандраў (Мінск, 2005).** 1.e4 e5 2.Kf3 Kc6 3.Cb5 Kf6 4.d3 Cc5 5.0-0 Kd4 6.K:d4 C:d4 7.c3 Cb6 8.Cg5 h6 9.Ch4 c6 10.Ca4 d6 11.Kph1 g5 12.Cg3 h5 13.f3 h4 14.Cf2 Kh5 15.Фe1 Фf6 16.Kd2 Kg3+ 17.C:g3 hg 18.Ф:g3 Ce3, белыя здаліся.

А ў партыі **А. Аляксандрава з Дэлармэ (Памплона, 2009)** склалася наступная сітуацыя.

Белыя: Kph2, Фg3, Лd4, Cc3, пп. b2, e3, f2, g2, h4 (9).

Чорныя: Kpg8, Фe6, Лe8, Cg6, пп. b5, f7, g7, h6 (8).

Партыя працягвалася так: 31.h5 C:h5 32.Лe4, і чорныя здаліся.

* * *

Гэтыя прыклады мы ўзялі з брашуры Віктара Жука "Творчасць беларускіх шахматыстаў" (2016). Ёсць там і партыі звычайных аматараў, у тым ліку самога аўтара. Прывядзём адну з іх.

**В. Жук — В. Губанаў (1977).** 1.e4 e5 2.Kf3 Kc6 3.Cb5 Kge7 4.0-0 a6 5.Ca4 h6 6.c3 f6 7.Kh4 g6 8.Фf3 Cg7 9.Фg3 g5 10.Cb3 Ka5 11.Cd1 h5 12.b4 Kc4 13.d3 Kd6 14.Cb3 Kb5 15.f4 ef 16.C:f4 Ch6 17.C:g5 C:g5 18.e5 C:h4 19.Ф:h4 f5 20.Фf6 Лf8 21.Фh6 d5 22.e6 C:e6 23.Ф:e6 Фd6 24.Фe2 Фg6 25.Лe1 0-0-0 26.Ф:e7, чорныя здаліся.

А вось задача-мініяцюра **Віктара Жука,** якую прапануем чытачам рашыць самастойна *(гл. дыяграму).*



Белыя: Kpd5, Фg2, Ch2 (3).

Чорныя: Kpf5, пп. d7, f6 (3).

Мат у 4 хады.

Калі белага ферзя пераставіць на g3, атрымліваецца задача-блізня, дзе таксама трэба знайсці мат у 4 хады.

**Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул.Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.**

Задача М. Бельчыкава з мінулага выпуску рашаецца так: 1.Фf3! Kp:c4 2.Лa4x, 1...Kpe5 2.Ф:d5x, 1... dc 2.Лd5x

**Вадзім ЖЫЛКО.**

## Пятніца, 28 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 1.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар».**
**12.10, 17.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 16.30 Меладрама «Я пакідаю Вам каханне».**
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**22.00 Меладрама «Сям'я маньяка Бяляева».**
**1.40** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 20.55** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00 Дэтэктыў «Такая работа».**
**9.55** Рэпарцёр.
**10.40** Капейка ў капейку.
**11.10** «Анлайн». Скетчкам.
**11.40, 17.15 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**12.15, 17.55 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.15, 18.50 Серыял «Васьмідзясятыя». Заключныя серыі.**
**14.25** «Моду народу». Заключны выпуск.
**15.30** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.15, 1.25 Трылер «Анёл ці дэман». Заключная серыя.**
**21.10** «Бітва экстрасэнсаў. 13 сезон».
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.30** Хачу ў тэлевізар!
**23.35 Камедыя «Super-Перцы».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.30, 18.10, 21.00** Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**7.55, 15.45 «Блуканне па пакутах». Драма, заключныя серыі.**
**10.15, 20.00** «Фаварыт язычніцкага бога». «Спецыі для спецкулінарыі».
**10.55 «І зноў Анiскін». Камедыя, заключная серыя.**
**12.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці скульптара, народнага мастака БССР Андрэя Бембеля.
**12.45, 18.25** «Размаўляем па-беларуску».
**12.55 «Пакліч мяне ў далячынь светлую». Кінаапавесць.**



**14.25** «Легенды музыкі». Юрый Малікаў.
**14.50** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-2004».
**18.30** «Камертон». Рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Віктар Клімчук.
**19.00 «Гвараздзік». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.15** «Час кіно».
**21.25 «Тарзан бясстрашны». Прыгоды.**
**22.50** «Подых струн».

### Беларусь 5

**8.00, 19.15, 21.45** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Хакей. КХЛ. «Лакаматыў» (Яраслаўль) — «Дынама-Мінск».
**10.05** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 3-ці тур. Агляд.
**11.00, 14.30, 21.55** Тэніс. WTA. Выніковы турнір. Сінгапур.
**13.00** Гандбол. SEHA-ліга. «БГК імя Мяшкова» (Беларусь) — «Заграб» (Харватыя).
**16.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 3-ці тур. «Барселона» (Іспанія) — «Манчэстэр Сіці» (Англія).
**18.25** Козел пра футбол.
**18.45** Піт-стоп.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Масква) — «Ёкерыт» (Хельсінкі).

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.20** «Адваротны адлік». «Доктар Слон. Стаўка на чырвонае».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Час пакажа».
**16.20 Камедыі «Белыя Росы».**
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Голас». Новы сезон.
**22.55** «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі».
**0.00** «Вячэрні Ургант».
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.40** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Дзіўная справа».
**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Аўтапанарама».
**16.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** 1/4 фіналу Міжнароднай лігі КВЗ.
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00 Маст. фільм «Дрэнная слава».**
**0.45** «Зорны рынг». Дайджэст.

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.00** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00, 1.30 Серыял «Калыска над безданню».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Жыццё і прыгоды Мішкі Япончыка».**
**16.10** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.05 Серыял «Чалавек-прынада».**
**19.20 Серыял «Пончык Люся».**
**21.00 Серыял «Пончык Люся-2».**
**23.40 Маст. фільм «Гараж».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Сваты».**
**19.10, 20.40 Серыял «Касатка».**
**21.45, 23.10** «Гумарына».
**23.50 Маст. фільм «Муж шчаслівай жанчыны».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**8.30** «Студыя Юліі Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Урачэбная тайна».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40** «Экстрасэнсы супраць дэтэктываў».
**21.05 Маст. фільм «Проста Джэксан».**
**22.50** «Большасць». Ток-шоу.
**23.55** «Мы і навука. Навука і мы». «Іншая ежа».

### 8 канал

**6.30** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Камедыя «Ракако».**
**12.30** Дак. фільм «Нікола Тэсла. Уладар свету».
**13.15 Серыял «Станіца».**
**14.04 Камедыя «Фокус».**
**15.55, 19.05, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.00** «Золата маўчання».
**17.20 Серыял «Ідэальная пара».**
**18.10, 19.10, 21.00** «Хатняя крама».
**18.15 Серыял «Фартыцыюд».**
**19.15 Серыял «На ўсе застаўкі».**
**20.50** «Вячэрніца».
**21.10 Фантастыка «Асаблівая думка».**

### ВТБ

**6.00, 17.00. 5.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.30** Меладрама «Дзяўчына майго лепшага сябра».
**11.30, 21.00, 1.15** «Уральскія пельмені».
**12.10, 20.20** Серыял «Мамачкі 2».
**13.20** Серыял «Апошні з Магікян 5».
**14.00** Серыял «Два бацькі, два сыны 3».
**14.40** Серыял «Косці».
**15.50, 19.10** Серыял «Маладзёжка 4».
**21.30** Камедыя «Бландзінка ў эфіры».
**23.40** Камедыя «Голыя перцы».
**2.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Мільёны ў сетцы».
**4.00** Скетч-шоу «Валера ТБ».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.20** «Гісторыя адной містыфікацыі. Пушкін і Грыбаедаў». Дак. фільм.
**11.00** «Берастa-бяроста». Дак. фільм.
**11.15** «Каломба». Серыял.
**12.45** «Андрэйч». Дак. фільм.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.40** «Пісьмы з правінцыі». Прыморскі край. Шкатоўскі раён.
**14.10** «Іваноў». Серыял.
**15.10** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**15.55** Квіток у Вялікі.
**16.35, 2.40** Сусветныя скарбы.
**16.50** Вялікая опера-2016.
**18.55** «Барыс Аверын. Універсітэты». Дак. фільм.
**19.45** 80 гадоў Раману Віктюку. «Рэквіем па Радамесу». Спектакль тэатра Сатыры.
**21.45** «Лінія жыцця». Раман Віктюк.
**22.40** Міжнародны дзень анімацыі. «Брэменскія музыканты». «Старая пласцінка». «Жыў-быў сабака». М/ф.
**23.45** Мастсавет.
**23.50** Партрэт пакалення. «Дурань». Маст. фільм.
**1.55** «Шукальнікі». «Паражэнне Івана Грознага».

### Настальгія

**6.00** «Сляём, сябры!» з Наталляй Казялковай.
**7.15** Маст. фільм «Нікуды не вартая».
**8.40, 9.40, 11.00, 12.55, 14.30, 15.40, 17.00, 20.30, 23.20, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.10** «Песня-82». 2-е аддзяленне.
**12.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**13.30** Маст. фільм «Ішоў сабака па раялі».
**17.20** Дак. фільм «Іосіф Бродскі. Паэт пра паэтаў».
**18.00** «Маленькія камедыі вялікага дома». Спектакль Маскоўскага тэатра Сатыры. 1974 год.
**21.50** «Прэс-экспрэс». 1995 год.
**22.00** «Колба часу».
**23.00** «Час пік». Памяці У. Лісцьева. 1995 год.
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Піліткоўскім: «Куба — любоў мая!» 2007 год.
**1.00** Фільм-спектакль «Варшаўская мелодыя». 1969 год.
**5.20** Дак. фільм «Зоркі савецкага спорту».

### EuroSport 1

**5.00, 13.30, 20.30, 2.30** Веласпорт. Шэсць дзён Лондана.
**7.00, 9.00, 14.30, 1.00** Снукер. International Championship.
**12.00, 17.30, 19.00, 4.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.

### Кінакамедыя

**0.40** Меладрама «Сведка на вяселлі».
**2.25** Камедыя «Усё магу».
**4.00** Камедыя «Гэта пройдзе, але калі?»
**5.35** Меладрама «Красуні».
**7.15** Меладрама «Справа ў табе».
**8.55** Камедыя «Сёння ў меню».
**10.40** Баявік «Вялікі салдат».
**12.20** Камедыя «Вясельная вечарынка».
**14.00, 14.55, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Мой самы страшны кашмар».
**17.50** Камедыя «Трайныя непрыемнасці».
**19.30** Камедыя «Ас з асаў».



**21.20** Меладрама «Спатканне ўслепую».
**23.05** Меладрама «Вельмі моцна закаханы».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.30** «Доктар І...»
**8.00, 18.50, 2.20** «Асколкі». Серыял.
**9.45, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.30** «Сляпая».
**12.30** «Варажбітка».
**13.35** «Паралельны свет».
**14.35** «Шафа».
**15.25** «Здзелка».
**15.55** «Людзі пятніцы».
**16.50** «Рэвізора».
**17.50** «Знахаркі».
**20.55** «Аднойчы ў Вегасе». Камедыя.
**22.50** «Зоркі. Тайны. Лёсы».
**23.45** «Каліфрэнія». Серыял.
**0.15** «Гульня». Трылер.



**4.00** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 18.15** Драма «Мой анёл-ахоўнік».
**8.10** Камедыя «Кухар на колах».
**10.10** М/ф «Легенды начных вартавых».
**12.10** Фантастыка «Пасвячоны».
**14.10** Трылер «Версія».
**16.20** Фантастыка «Па-за часам».
**20.10** Трагікамедыя «Гэтай раніцай у Нью-Ёрку».
**22.00** Камедыя «Іствікскія ведзьмы».
**0.10** Драма «Герцагіня».
**2.05** Драма «Залатое стагоддзе».
**4.00** Фантастыка «Двухсотгадовы чалавек».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Баявік «СМЕРШ».
**8.45** Фантастыка «Адарванне».
**10.25** Трагікамедыя «Анучны саюз».
**12.20** Камедыя «Па вуліцах камоду вадзілі...»
**13.35** Казка «Чорная курыца, або Падземныя жыхары».
**14.55** Меладрама «На свеце жывуць добрыя і харошыя людзі».
**16.45, 2.00** Серыял «Купрын. Упоцемку».
**20.20** Драма «Тата».
**22.20** Меладрама «Блаславіце жанчыну».
**0.30** Камедыя «Даўн Хаус».
**4.05** Драма «Высоцкі. Дзякуй, што жывы».

### National Geographic

**6.00** Прарыў.
**6.50, 13.25, 20.10, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 14.55, 0.05** Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
**8.45, 15.40, 21.45, 1.40, 4.50** Уварванне на Зямлю.
**9.30, 17.10** Ледзяная дарога.
**10.20, 18.00** Шаша праз пекла.
**11.05** Сапраўдны суперкар.
**11.55, 14.10, 19.30, 23.20, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**12.40, 18.40, 2.30** Чалавек супраць YouTube.
**16.30, 22.30** Другая сусветная вайна.
**21.00, 0.50, 4.00** Тайны старажытнасці.

### Discovery

**8.00, 14.00** Аляска: сям'я з лесу.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 11.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Багажныя войны.
**11.30** Акіян, які аглушае.
**13.00** Дарогі Расіі.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** На краю Аляскі.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 6.20** Што было далей?
**1.30, 6.45** Хаос у дзеянні.
**2.00, 4.40** Самагоншчыкі.

## Субота, 29 кастрычніка

### Беларусь 1

6.20 Існасць.
**6.45 Меладрама «Дзённік свекрыві».**
8.30 Буйным планам.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 Клуб рэдактараў.
**9.50 Серыял «Сваты-6».**
11.05 50 рэцэптаў першага.
12.10 Дача.
12.50 Вялікі селфі-тур.
13.25 Трансфармацыя.
14.05 Здароўе.
15.15 Краіна.
**15.45 Меладрама «Сям'я маньяка Бяляева».**
**19.20 Камедыя «Камінны госць».**
21.00 Панарама.
**21.40 Меладрама «Тэорыя неверагоднасці».**
1.05 Дзень спорту.

### Беларусь 2

7.05 Сіткам «Розныя».
7.30 «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
8.35, 20.55 Тэлебарометр.
**8.40 Серыял «Шчаслівыя разам 3».**
10.10 Выбар гледачоў. Анімацыйны фільм «Артур і вайна двух светаў».
11.55 Капейка ў капейку.
12.35 «Вялікая ілюзія на Кіпры».
13.10 «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
14.20 «Моду народу».
15.25 «Бітва экстрасэнсаў. 13 сезон».
17.35 «Сям'я». Рэаліці-шоу.
18.50 «Здзіві мяне 3». Талент-шоу.
**21.10 Баявік «Чалавек-павук».**
22.00 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
23.35 Хачу ў тэлевізар!
**23.40 Трылер «Прывіды».**

### Беларусь 3

8.00, 14.25, 16.35, 21.00 Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**8.15 «Якая ў Вас усмешка?» Камедыя.**
9.45 «Легенды музыкі». Юрый Малікаў.
10.05 Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-2004».
**11.00 «Я родам з дзяцінства». Кінааповесць.**
12.30 «Майстар. Рэжысёр Віктар Тураў». Дак. фільм.
13.25 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
13.55 «Край».
14.40 «Час кіно».
**14.45 «Ніхто замест цябе». Кінааповесць.**
16.05 «Камертон». Піяніст, кампазітар, джазмен Сяргей Жылін.
16.50 «Навукаманія».
**17.20 «Цішыня». Драма.**
20.40 «Калыханка».
21.20 «Цвярдыні свету». «Ладакх. Зямля Буды і Майтрэі».
**21.55 «Беларускі вакзал». Драма.**



23.30 «Бард-парад».

### Беларусь 5

8.00, 21.40 PRO спорт. Навіны.
8.10 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Масква) — «Ёкерыт» (Хельсінкі).
10.00 Фактар сілы.
10.30 Піт-стоп.
11.00, 19.05, 21.50 Тэніс. WTA. Выніковы турнір. Сінгапур. 1/2 фіналу.
13.00 Плаванне. Этап Кубка свету. Ганконг.
15.10 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — «Белшына» (Бабруйск).
17.25 Гандбол. SEHA-ліга. БГК імя Мяшкова (Беларусь) — «Гарэньє» (Славенія).
21.10 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.

### АНТ

7.00 «Суботняя раніца».
8.00, 9.00, 16.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
9.05 М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
9.25 «Здароўе».
10.25 «Смак».
11.00 «Ідэальны рамонт».
11.55 «Разумніцы і разумнікі».
12.40 Тэлечасопіс «Гумарынка».
**12.55 Маст. фільм «Гаспадар тайгі».**
14.30, 16.20 Музычны фестываль «Голосящий КиВиН 2016».
16.15 (з субцітрамі), 21.00 Навіны спорту.
17.50 «Хто хоча стаць мільянерам?»
18.50 «Мой бізнес».
21.05 «Сёння ўвечары».
22.20 «Усё складзецца».
23.05 «МаксімМаксім».
0.10 «Падмаскоўныя вечары».

### СТБ

**6.15 «Няўдачнікаў.net». Серыял.**
**8.00 Маст. фільм «Два доўгія гудкі ў тумане».**
9.20 «Рамонт па-сумленнаму».
10.05 «Ежа багоў».
11.00 «Мінск і мінчане».
**11.35 «Дэмбельскі альбом». Серыял.**
13.30, 16.30, 19.30 «24 гадзіны».
**13.45, 1.55 Камедыя «Жаната халасцяк».**
15.25 «Вадзіць па-руску».
15.50 «Вялікі горад».
16.40 «Наша справа».
16.55 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
18.40 «Прагнасць».
20.00 «СТБ-спорт».
20.10 «Нам і не снілася».
**22.35 «Жаданая». Серыял. Заключныя серыі.**

### МІР

**6.00 Серыял «Калыска над безданню».**
7.55 «Саюзнікі».
8.20 М/ф.
9.00 «Вой, мамачкі!»
9.30 «Мой лепшы сябар».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Здабытак рэспублік».
**10.45, 23.05 Серыял «Дванаццаць крэслаў».**
13.40 «Цяжар абеду».
**14.10 Маст. фільм «Гараж».**



**16.15 Серыял «Лекі супраць страху».**
**1.55 Серыял «Калыска над безданню».**

### РТР—Беларусь

7.00 «Пакой смеху».
**7.45 Маст. фільм «Сашка, каханне маё».**
11.00, 14.00 Весткі.
**11.20 Маст. фільм «Збянтэжанасць пачуццяў».**
